ВІНШУЕМ З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ!

ДАРАГІ ТАВАРЫШ!

Напружанай, ударнай працай знамянуюць працаўнікі гарадоў і вёсак гэты, юбілейны для нашай Радзімы год — год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Усюды ідзе самаадданая праца па выкананню велічных планаў дзесятай пяцігодкі, памнажаюцца багацці і набыткі нашай краіны. Разам са старэйшымі таварышамі на самых адказных участках камуністычнага будаўніцтва працуюць і твае равеснікі — камсамольцы 70-х гадоў. Прыняўшы працоўную эстафету, яны імкнуцца жыць, працаваць, вучыцца, змагацца і перамагаць, як завяшчаў вялікі Ленін.

Толькі што з будоўляў трэцяга працоўнага семестра-77 вярнуліся твае таварышы па студэнцкай лаўцы. Іх больш дзвюх тысяч—байцоў СБА універсітэта. Яны працавалі на БАМе і ў раёнах Нечарназем'я, у Карэліі і Малдавіі, у горадзе-героі Мінску і Мінскай вобласці. Іх працай упісаны важкі радок у працоўную аповесць краіны і рэспублікі. Дзейнасць студэнтаў-будаўнікоў не абмяжоўваецца толькі будоўляй — усюды на месцах дыслакацыі яны праводзяць вялікую грамадска-палітычную работу.

Сёння трэці працоўны семестр працягваецца. У саставе студэнцкага атрада ты прымаеш удзел у сельгасработах. Твой абавязак — дапамагчы працаўнікам вёскі ў тэрмін убраць з палёў ураджай. Мы верым, што ты з гонарам выканаеш яго, унясеш пасільны ўклад у гэту агульнанародную справу, разам з таварышамі па групе, курсу арганізуеш і будзеш праводзіць лекцыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую і шэфскую работу сярод мясцовага насельніцтва.

Асаблівасць тваіх працоўных будняў заключаецца і ў тым, што па ўсёй краіне ідзе ўсенароднае абмеркаванне праекта Канстытуцыі СССР, у якім і ты прымаеш самы актыўны ўдзел.

Таварыш!

Рэктарат, партком, камітэт камсамола і прафком аб'яўляюць агляд атрадаў па выніках сельгасработ. Змагайся за права называцца пераможцам агляду!

Высока нясі званне камсамольца, савецкага студэнта, будзь дастойным імя вялікага Леніна, імя, якое з вялікім гонарам носіць наш універсітэт.

РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ.

ЮБІЛЕЙНАМУ ГОДУ — НАШЫ СПРАВЫ

Сёння мы ўступаем у новы навучальны год, які для ўсіх нас стане знамянальным: год 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Толькі пасля рэвалюцыі стала магчыма стварэнне ў Беларусі такой буйной навучальнай установы, як універсітэт. Прайшоўшыя гады работы універсітэта адзначаны вялікай працай некалькіх пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў, станаўленнем навуковай сталасці, умацаваннем матэрыяльнай базы БДУ, дазволіўшай рыхтаваць сапраўды высокакваліфікаваных спецыялістаў, веды якіх адпавядаюць патрабаванням сучаснай вытворчасці.

Стварэнне нашага універсітэта паклала пачатак бурнаму росту нацыянальных кадраў Беларусі. На яго аснове фарміраваліся і мацнелі ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі.

Ва універсітэцкіх сценах былі закладзены асновы шэрагу галін беларускай навукі. Тут атрымалі адукацыю і раскрылі свой талент выдатныя прадстаўнікі нашай навукі, літаратуры, мастацтва, культуры.

Юбілейны год — гэта не толькі вялікае свята, гэта напружаная праца. І трэба зрабіць усё для таго, каб ён пакінуў прыкметны крок у гісторыі універсітэта і прынёс новыя поспехі ў падрыхтоўцы сапраўды высокакваліфікаваных спецыялістаў, загартаваных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

А. МАЛЫШАЎ,
прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце прыродазнаўчых факультэтаў.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР
1
ВЕРАСНЯ
1977 г.

№ 24 (1174)

Цана 2 кап.

ПАСТАНОВА

БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ УДЗЕЛЕ СТУДЭНТАЎ УНІВЕРСІТЭТА ВА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ 1977 ГОДА».

30 жніўня 1977 г.

У пастанове ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб мерах па забеспячэнню своечасовай уборкі, нарыхтоўкі і адгрузкі бульбы ў 1977 годзе» адзначаецца, што партыйныя, савецкія і сельскагаспадарчыя органы, кіраўнікі і спецыялісты калгасаў і саўгасаў, усе працаўнікі вёскі ў бягучым, юбілейным годзе забяспечылі своечасовае і якаснае правядзенне комплексу работ па вырошчванню бульбы і заклалі добрую аснову для атрымання запланаванага ўраджаю.

У шэрагу мер, накіраваных на забеспячэнне своечасовага і якаснага правядзення ўсяго комплексу работ па ўборцы вырашчанага ўраджаю, прадугледжваецца і прыцягненне да ўборачных работ з 1 верасня па 1 кастрычніка г. г. студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

Ва ўборцы ўраджаю гэтага года прымуць удзел 6200 студэнтаў універсітэта. Кожны камсамолец-студэнт павінен разглядаць свой удзел ва ўборцы ўраджаю як важную грамадскую справу, паказваць узор камуністычных адносін да працы, узмацняць у студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадах (ССГА) працоўную дысцыпліну, строга выконваць правілы тэхнікі бяспекі.

Байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта ў ліпені-жніўні г. г. праявілі сапраўдны клопат аб усенароднай справе — уборцы хлеба, аказаўшы значную дапамогу гаспадаркам на месцах дыслакацыі. Іх ініцыятыва была падхоплена ўсімі СБА рэспублікі і адобрана сакратарыятам ЦК ЛКСМБ. Гэта добры прыклад, добры пачын для нашай работы ў верасні.

Штогод студэнты універсітэта, дапамагаючы працаўнікам сяла ўбіраць ураджай, праводзяць таксама вялікую лекцыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую і шэфскую работу сярод насельніцтва, сельскіх школьнікаў. У гэтым, юбілейным для нашай Радзімы годзе студэнцкія сельскагаспадарчыя атрады павінны аддаць гэтай рабоце асаблівую ўвагу.

Бюро камітэта камсамола пастанаўляе:

1. Удзел студэнтаў ва ўборцы ўраджаю 1977 года лічыць найважнейшым партыйным даручэннем камсамольскай арганізацыі універсітэта, справай кожнага камсамольца, кожнага студэнта.

2. Палажэнне аб студэнцкім сельскагаспадарчым атрадзе (ССГА) зацвердзіць.

3. Камітэтам камсамола факультэтаў сфарміраваць атрады да 31 жніўня г. г. (колькасць атрада 25 чалавек). Да 1 верасня падабраць і зацвердзіць на сваіх пасяджэннях камандзіраў і камісараў, актыў атрадаў. У якасці камандзіраў і камісараў рэкамендаваць камсамольскіх актывістаў, удзельнікаў трэцяга працоўнага семестра.

4. Ва ўсіх атрадах напярэдадні выезду правесці сходы, на якіх абмеркаваць пастанову ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб мерах па забеспячэнню своечасовай уборкі, нарыхтоўкі і адгрузкі бульбы ў 1977 годзе» (газета «Знамя юности» ад 24 жніўня 1977 года), прыняць сацыялістычныя абавязацельствы, якія адлюстроўваюць вытворчую і грамадска-палітычную дзейнасць атрада.

5. Палажэнне аб агульнаўніверсітэцкім аглядзе-конкурсе ССГА зацвердзіць.

6. На аснове агульнаўніверсітэцкага палажэння распрацаваць і зацвердзіць на пасяджэннях камітэтаў камсамола палажэнне аб аглядзе-конкурсе ССГА.

7. У другой палове верасня ва ўсіх ССГА правесці Дзень ударнай працы. Заробленыя грошы пералічыць на рахунак Маскоўскага РК ЛКСМБ г. Мінска.

8. Ва ўсіх ССГА правесці сходы, на якіх абмеркаваць праект Канстытуцыі СССР.

9. Штабам ССГА па заканчэнні работ правесці грамадска-палітычную атэстацыю студэнтаў — байцоў ССГА.

10. Камітэтам камсамола факультэтаў да 10 кастрычніка г. г. падвесці вынікі сацспаборніцтва на факультэтах, дакументы на лепшы атрад прадставіць у штаб працоўных спраў камітэта камсамола універсітэта.

11. Штабу працоўных спраў камітэта камсамола БДУ падвесці вынікі агульнаўніверсітэцкага агляду-конкурсу да 15 кастрычніка г. г.

12. Кантроль за выкананнем данай пастановы ўскласці на штаб працоўных спраў.

Бюро камітэта камсамола універсітэта выражае ўпэўненасць, што, адказваючы на бацькоўскі клопат партыі, камсамольцы, усе студэнты універсітэта прымуць актыўны ўдзел ва ўборцы ўраджаю юбілейнага, 1977 года, даб'юцца высокіх паказчыкаў у вытворчай і грамадска-палітычнай рабоце.



Дарагія першакурснікі! Сёння вы сталі студэнтамі, папоўнілі шматтысячны калектыў нашага універсітэта. Знамянальным з'яўляецца тое, што вы прыйшлі ў БДУ напярэдадні 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вам працягваць слаўныя традыцыі мінулых гадоў, вам вырашаць задачы, пастаўленыя XXV з'ездам КПСС перад студэнтамі ў дзесятай пяцігодцы. Прыміце шчырыя віншаванні з пачаткам вашага студэнцкага жыцця!

● Ура! Студэнткі!

Фотаэцюд **М. Дубовіка** і **М. Федарэнкі.**

Адысея тваіх калег

СВІТАННІ НАД БЕРКАКІТАМ

«Берк» на мове мясцовых жыхароў — паляўнічая хатка. Прыйшлі будаўнікі пракладваць чыгунку, дадалі да слова «берк» слова «кіт» (вялікі, велічны), і нарадзілася — Беркакіт.

Кароткая, але вельмі ёмістая гісторыя Беркакіта:

1975 год.

18 снежня. На месцы будучага пасёлка высадзіўся першы будаўнічы дэсант — брыгада Васіля Кудара.

1976 год.

25 студзеня. Брыгада Івана Назарава залажыла першы фундамент пад рабочы інтэрнат на 27 месц.

7 сакавіка. Заселены першыя дамы, якія зманціравала брыгада Уладзіміра Дзятко.

24 красавіка. У пасёлку нарадзілася першае дзіця.

2 ліпеня. Адкрыт першы магазін.

8 жніўня. Выпечаны першы беркакіцкі хлеб.

15 кастрычніка. У жылыя дамы пададзена цяпло ад цэнтральнай кацельнай...

Так нараджаўся вядомы пасёлак — канцавая станцыя лініі БАМа Тында — Беркакіт. Гэтыя даты, імёны першапраходцаў будоўлі веку ведае тут кожны будаўнік.

А час кліча наперад — гісторыя Беркакіта працягваецца:

1977 год.

8 ліпеня. Напоўніўся звонкімі дзіцячымі галасамі «Арляня» — першы ў пасёлку піянерскі лагер.

1 верасня распахне дзверы школа на 392 месцы. Будуюцца універмаг, халадзільнік, жылыя дамы...

Напярэдадні 60-годдзя Савецкай улады ў пасёлак прыйдзе першы цягнік. Будаўнікі ўзялі абавязацельствы здаць участак чыгункі Тында — Беркакіт датэрмінова, 29 кастрычніка, да дня нараджэння Ленінскага камсамола.

Упіша свой радок у летапіс Беркакіта і наш атрад, у саставе якога студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Байцам даручылі будаўніцтва унікальнай жалезабетоннай водапрапускной трубы — важнага аб'екта на «малым» БАМе.

Юрый Голубеў — брыгадзір 1-й брыгады. Ён ветэран будатрадаўскага руху і СБА імя Ленінскага камсамола. Ужо быў на БАМе ў мінулым годзе. Будаваў цеплатрасу ў пасёлку Залацінка.

Пыхкае кран — цяжкая бодня з бетонам. Махае рукамі ў вялікіх белых рукавіцах Юрый —накіроўвае рухі кранаўшчыка.

Увечары ў Беркакіце цішыня. Толькі ўдалечыні гудзе перасоўная электрастанцыя ды бурчаць самазвалы: ідзе будаўніцтва чыгуначнага насыпу. Прыціх студэнцкі лагер. Хто пісьмо піша ў родны горад, хто газету чытае... Вольга Гашына бярэ ў рукі гітару. Шкада, што вы не чулі, як яна спявае:

Якутия, ты лесами окутана.
Якутия — ожерелье из грез.
Якутия, над табой небо синее,
Сосны пахнут Россиею.
Жаль, что нету берез.

...Ранішняя зара шырыцца, святлее. Далёкія сопкі на яе фоне — светла-ультрамарынавыя, іншую можна прыняць за воблачка. Пахне тайгой. Як і раней, бурчаць самазвалы. Гарыць зара — ідзе новы дзень.

В. ГУРЭЦКІ,
баец СБА імя Ленінскага камсамола.



Кожны працоўны семестр пачынаецца так: гучаць хвалюючыя словы наказу, парады сяброў і старэйшых таварышаў.

23 чэрвеня 1977 года. Мінск, універсітэцкі гарадок. Мітынг, прысвечаны пачатку трэцяга працоўнага семестра.

Наперадзе — напружаныя працоўныя будні, стома і... радасць працы. А пакуль што... Пакуль што — апошнія хвіліны развітання з родным універсітэтам.

Вяртайся з перамогай, студэнт-будаўнік!

Фота **М. Чалея.**

ПОШТА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

«Радзімічы» на Пскоўшчыне

Ударна працавалі байцы будатрада «Радзімічы» на камсамольскай будоўлі Нечарназем'я. Атрадам асвоена звыш 50 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Высокіх паказчыкаў у штодзённай працы дабіваліся такія байцы, як В. Шынкевіч, В. Кавалеўскі, Н. Жэчка і іншыя.

На высокім узроўні праходзілі ў атрадзе дні ўдарнай працы. Наш атрад займае першае месца ў Новаржэўскай імя Кастрычніцкай рэвалюцыі зоне.

Вялікая ўвага ўдзялялася агітацыйна-прапагандысцкай рабоце. Атрадная агітбрыгада, якой кіруе лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Н. Сымон, дала 6 канцэртаў. Лектарская група прачытала шэраг лекцый прававога характару. Байцы атрада наведалі Святагорскі манастыр і ўсклалі кветкі на магілу А. С. Пушкіна.

У завяршаючы перыяд работы атрад прыклаў максімум намаганняў для таго, каб унесці пасільны ўклад у развіццё Нечарназем'я, якое па праву лічаць краем вялікіх магчымасцей і дзе ініцыятыва і творчасць маладых атрымліваюць вялікі размах.

П. ІВАНЕНКА,
баец СБА «Радзімічы».

І праца, як песня

Наш атрад працуе на будаўніцтве Дома культуры і гандлёвага цэнтра ў пасёлку Салаўі Пскоўскага раёна. План працоўнага семестра паспяхова выконваем.

Ударная праца, грамадска-палітычная работа атрада адзначаны Пскоўскім абласным штабам СБА: Льву Езавіту, нашаму байцу, уручана Ганаровая грамата, Мікалаю Ціхановічу — значок «Ударнік УСБА 1977 года», Станіславу Вабішчаву — каштоўны падарунак.

Ёсць узнагароды і ў атрадных артыстаў. На абласным злёце СБА ў Пскове яны заня-

ЛЕТА ПРЫНЯЛО

— Сцеражыся! — міма з паўнюткай тачкай бетону праносіцца Валерый Маскалёў. Ён адвозіць бетон у самыя далёкія куткі. Адразу ж Валянцін Лапікаў і Лена Рыбіна вібруюць яго. Прайшло паўгадзіны — бетону няма. Ён ужо закрыт кардоннымі шчытамі, поверх якіх ляжыць рубероід. Хлопцы збіраюцца разам, паяўляюцца транзістары. Гучыць музыка.

— Чаму ляжым? — да брыгады падыходзіць камандзір атрада Віця Надзёжны.

— Бетон укладзен, смецце прыбрана, ямы выкапаны, — жартуе Мікола Бялоў. Камандзір паварочваецца і ідзе ў прарабскую «круціць» тэлефон. Бетон прыбыў толькі к абеду. Працоўны настрой брыгады на ўвесь дзень быў сапсаван.

Але ў «Бацькаўшчыны» няма песімістаў. Прараб, калі не бы-

ФОТАРЭПАРТАЖ

ДЭБЮТ

«Бацькаўшчына» — не зусім звычайны будатрад. Наш працоўны семестр пачаўся толькі 1 жніўня, таму што «Бацькаўшчына», як і атрады «Юбілейны», «Аргакаўты», «Дэбютант» і «Купалінка», створан на базе падрыхтоўчага аддзялення. Студэнцкае жыццё для нас пачалося не з лекцый у аўдыторыі, а з будаўнічай пляцоўкі. Раніцай за намі ў інтэрнат прыязджае аўтобус з трэста № 7, і мы па знаёмых вуліцах Мінска едзем на работу.

— Майна! Крыху ў бок да лесвіцы павярні! Шчэ крыху! Стой! — зусім не па-будаўнічаму гучыць на даху кацельнай зычны голас Міколы Бялова, будучага юрыста.

Адкрываецца пашча каўша, і бетон валіцца на пліты. Тамара Бірыч, Валодзя Злобіч, Ігар Мартынаў разносяць бетон па пляцоўцы.

лі другое месца ў аглядзе агітбрыгад і трэцяе — у конкурсе палітычнай песні.

Агітбрыгада ўжо дала ў раёне дзесяткі канцэртаў. Але не толькі песня здружыла нас з моладдзю Пскоўшчыны. Разам мы праводзім спартыўныя спаборніцтвы, вечары адпачынку.

В. ШАУЧУК,
баец СБА «Подзвіг» БДУ імя У. І. Леніна.

Як сапраўдныя будаўнікі

У байцоў атрада «Кастрычнік» фізічнага факультэта справы ідуць, як у запраўскіх будаўнікоў.

За ваколіцай пасёлка Гаўры два тыдні назад падняліся будаўнічыя лясы. Цікаўныя жыхары прыходзілі сюды паглядзець, як ідуць справы на новабудоўлі, аб якой даўно марылі бульбаводы. Сховішча на 1000 тон вельмі патрэбна гаспадарцы.

Прайшло зусім мала часу, а ўжо гатова адна сцяна, расце другая. Побач будуюцца падсобныя памяшканні. У ліку перадавікоў Тарэза Гудзіноўская, Валерый Валканоцкі, аб якім рабяты гавораць: «Прыроджаны муляр».

Валерый адказваць не спяшаецца, усміхаецца.

— Кладка сцен — гэта таксама рамантыка, а калі хочаце — пераўтварэнне зямлі-матулі!

Да фінішу на кладцы першай сцяны дзве брыгады, якія працавалі на аб'екце, прыйшлі разам.

— Сховішча ў гаспадарцы будзе, — упэўнена гавораць у пасёлку.

А зусім нядаўна на адкрытым партсходзе атрада абмяркоўвалі праект новай Канстытуцыі СССР. З хваляваннем гаварылі аб клопаце дзяржавы аб народнай адукацыі, бо гэты клопат студэнты адчуваюць штодзённа.

— Праект новай Канстытуцыі адабраем і падтрымліваем. Абавязваемся ўдарнай працай і выдатнай вучобай адзначыць 60-годдзе Вялікага Кастрычніка — такое рашэнне прынялі байцы атрада.

А. ДУБРАВІН.

Справы «Фатона»

Раніца. Над узгоркамі зялёнага гаю ўстае чырванаватае абветранае сонца. Новы дзень толькі займаецца, а на будоўлі ўжо снуюць сюды-туды павароглівыя ЗіЛы, вёрткія газікі», звіняць кельмы і раздаецца дружнае: «І раз, яшчэ раз!» Гэта працуюць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў...

Раніцай мы бачылі толькі чыстае поле, а ў канцы дня з-за прыгорка ўжо выглядвалі сцены кармасховішча: атрад «Фатон» радыёфізічнага факультэта будуе жывёлагадоўчы комплекс у вёсцы Лукіна на Пскоўшчыне, а побач — і аграгарадок: разам з байцамі з іншых атрадаў закладваюць фундамент пад жылыя дамы, дзіцячы сад, сталовую. Як гаворыцца, «першая цагліна» — за студэнтамі, а прадоўжаць іх справу, рабяты ведаюць, надзейныя рукі.

«Фатону» належыць асвоіць 150 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Сума немалая. Камандзір атрада Уладзімір Міхальчук гаворыць: «Нічога, справімся! Працуем па-студэнцку, а значыць, па-ўдарнаму. У нас тут такое сацспаборніцтва разгарнулася паміж брыгадамі атрада! А дэвіз які: нашай будоўлі — наш знак якасці! Больш 50 тысяч рублёў ужо асвоілі. У атрадзе — адносіны калектывізму, таварыскасці і ўзаемадапамогі: інакш проста нельга».

Мясцовым жыхарам студэнты спадабаліся: працазітыя рабяты. Увечары, пасля работы, байцы будуюць спортпляцоўку для школьнікаў, выступаюць з лекцыямі для мясцовых жыхароў, з канцэртамі. І на студэнцкіх вечарах адпачынку мясцовыя жыхары — заўсёды жаданыя госці.

Сельская школа цяпер зяе чысцінёй і парадкам: пафарбаваны вокны, падлога, адрамантаваны кабінеты. Прыведзен у парадак прышкольны ўчастак. Школьнікі і байцы атрада цяпер — самыя лепшыя сябры. Разам ходзяць у паход па месцах былых баёў, клапоцяцца аб помніку Невядомаму салдату, шэфствуюць над роднымі байцоў, загінуўшых у гады вайны.

Цяжка пералічыць усе цікавыя і добрыя справы атрада «Фатон». Проста імі пачынаецца і заканчваецца кожны працоўны дзень, звычайны, самы звычайны.

А. КАЛІНКА.

ПОШТА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

Матэрыялы гэтых старонак аб табе і для цябе, студэнт-будаўнік.

З фінішам вас, сябры, з паспяховай здачай вашага працоўнага экзамена.

ЭКЗАМЕН

ло бетону, знаходзіў іншую работу — то цэглу трэба перанесці, то складзіраваць будаўнічыя матэрыялы, то ямкі выкапаць пад слупы. І ўсё ж крыўдна было нам, што з-за нядбайнасці кіраўнікоў будоўлі энергічная працоўная брыгада павінна марна траціць час.

Другая брыгада атрада на чале з камісарам Аляксандрам Гамола працуе на будаўніцтве фінскага доміка. Тут справы ідуць больш зладжана, рытмічна. Але не абыходзіцца і без нечаканых эксцэсаў. То няма бетону, то цвікоў, то звычайнага пяску.

Але, нягледзячы на цяжкасці, добра працаваць у гурце, калі адчуваеш локаць сябра, яго падтрымку, параду.

Міжволі ўсплываюць у памяці першыя дні работы. Як першакласнікі, нерашуча тапталіся мы на пляцоўцы, не ведаючы, з чаго пачынаць... Праз колькі часу люба было глянуць на работу Ігара Мартынава. Быццам ён заўсёды меў справу з бетонам і цэглай. Паявіліся першыя перадавікі. Кожны вечар камандзір называў імёны лепшых. Гэта былі Аляксандр Марчанка, Тамара Бірыч, Валодзя Вярбіцкі, Саша Драздзевіч і яшчэ шмат байцоў.

Вечарамі сумаваць няма калі. Абмяркоўваюцца задачы на заўтра, вырашаюцца бягучыя пытанні. Дбайна рыхтуецца да лекцый Валодзя Злобіч. Неаднаразова ён выступаў перад рабочымі аб'екта.

У ленінскім пакоі, які з любоўю абсталявалі самі байцы, вельмі ўтульна. Тут заўсёды можна пачытаць кнігу, пазмагацца за шашачнай або шахматнай дошкай. Блакітны экран тэлевізара кліча паглядзець трансляцыю з Універсіяды-77.

Някепска выступала атрадная агітбрыгада ў аглядзе-конкурсе, які адбыўся сярод мінскіх гарадскіх будатрадаў. Асабліва спадабалася гледачам выступленне Валерыя Маскалёва. Свае вершы прачытаў Мікола Давідзюк.

Незабыўным для нас застанецца Дзень будаўніка. «Бацькаўшчына» прымала ўдзел у фестывалі, прысвечаным 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. У госці да студэнтаў прыйшлі заслужаныя будаўнікі рэспублікі, перадавікі вытворчасці, Героі Сацыялістычнай Працы. Да юнакоў і дзяўчат з прывітальным словам звярнуўся Герой Савецкага Саюза Павел Пятровіч Маладых.

Па прапанове ўдзельнікаў фестывалю былі ўскладзены вянкі да помніка У. І. Леніну. Гэты высокі гонар быў аказан байцам СБА «Бацькаўшчына».

Адзін за адным бягуць дні. Вось і закончылася працоўнае лета для байцоў традыцыйных СБА. Але наш працоўны семестр працягнецца да сярэдзіны верасня. Мы яшчэ больш пасябравалі за час сумеснай працы, і ніхто з нас не забудзе ніколі свой першы студэнцкі атрад. Не забыць ударную працу ў Фонд Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, будаўніцтва горада Гагарына і Палаца піянераў у Ханоі.

Шмат можна пісаць аб атрадзе, аб кожным з нашых байцоў. Гэта невычэрпная тэма...

М. ДУБОВІК.
Фота аўтара.



выкананні Уладзіміра Караля. [Фота В. Маскалёва].

Камандзір атрада «Бацькаўшчына» Віктар Надзёжны.

Добры працоўны настрой ніколі не пакідае Уладзіміра Злобіча.

Байцы СБА «Бацькаўшчына» ўскладаюць кветкі да помніка У. І. Леніну. [Фота В. Маскалёва].

НА ЗДЫМКАХ:

Хіба ж так капаюць!!

Прыемна слухаць песні ў

Надзвычай ажыўлена стала ў гэты дзень на вуліцах карэльскага пасёлка Калевала ад галасоў юнакоў і дзяўчат у зялёных форменках байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Гэта сабраліся на злёт СБА калевальскай зоны пасланцы беларускага студэнцтва.

У парку культуры і адпачынку, што раскінуўся на беразе маляўнічага возера Куйто, гучыць музыка. Атрады выстройваюцца на традыцыйную лінейку.

СВЯТА НА КАРЭЛЬСКАЙ ЗЯМЛІ

Гучыць каманда: «Раўняйсь! Смірна!». Камандзіры лінейных атрадаў здаюць рапарты камандзіру зоны М. Бялевічу, паведамляюць аб сваіх поспехах у працы.

Камісар занальнага штаба В. Хадзько падводзіць вынікі першага месяца працоўнага семестра. Адзначае, што байцамі СБА асвоена за гэты час больш як 500 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, прачытана 55 лекцый і дакладаў перад мясцовым насельніцтвам, арганізавана 6 выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці, праведзена 17 спартыўных сустрэч з мясцовай моладдзю, працуюць 7 бюро добрых паслуг і 8 кансультацыйных пунктаў. Лепшым сярод атрадаў зоны зарэкамендаваў сябе атрад імя акадэміка І. В. Курчатава, які асвоіў ужо 68 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Затым вопытам работы дзеляцца байцы і камандзіры лінейных атрадаў, выступаюць прадстаўнікі мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Лепшыя атрады і байцы атрымліваюць граматы райкома камсамола і каштоўныя падарункі.

Па традыцыі да абеліска і на магілу загінуўшых воінаў ускладаюцца вянкі, букеты жывых кветак. Байцы і госці ўшаноўваюць памяць загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны мінутай маўчання.

Пачынаецца агляд-конкурс агітбрыгад. У журы запрошаны работнікі раённага аддзела культуры, апарату райкома камсамола. На сцэну выходзяць лепшыя атрадныя спевакі і танцоры. Многія песні і вершы гучаць на нашай роднай беларускай мове, і іх мясцовыя слухачы сустракаюць з вялікай цікавасцю.

А побач праводзіцца агляд насценнага друку. Старшыня журы — рэдактар мясцовай раённай газеты «Камуніст Калевалы» П. Р. Ляонцьеў. На спартыўных пляцоўках разгортваюцца спаборніцтвы па валейболу і футболу. Атрадныя волаты перацягваюць канаты і выжымаюць гіры.

І вось урачыстае падвядзенне вынікаў свята. Лепшай прызнана агітбрыгада атрада «Факел» з інстытута замежных моў. У аглядзе насценнага друку першае месца падзялілі між сабой атрад імя І. В. Курчатава (БДУ) і атрад «Беларусь» (медыцынскі інстытут). Студэнты інстытута замежных моў перамаглі і ў спаборніцтве па валейболу. Мацнейшымі па перацягванню каната аказаліся хлопцы з атрада «Рытм» (БДУ). Баец гэтага ж атрада В. Лукашын перамог у выжыманні гір. Толькі па футболу з-за дрэннага надвор'я не ўдалося выявіць мацнейшую каманду — перамагла дружба.

М. ЧАЛЕЙ,
баец СБА «Верасы».

ПРЫМАЙ ЭСТАФЕТУ, ПЕРШАКУРСНІК!

Дарагія першакурснікі! Сёння вы сталі студэнтамі, большасць з вас улілася ў нашу амаль 11-тысячную камсамольскую арганізацыю. Знамянальным з'яўляецца тое, што папаўненне прыйшло напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Вам працягваць слаўныя традыцыі мінулых камсамольскіх год, вам вырашаць задачы, пастаўленыя XXV з'ездам КПСС перад студэнтамі ў дзесятай пяцігодцы.

У 1921 годзе, адразу ж пасля адкрыцця універсітэта, на рабочым факультэце аформілася і камсамольская арганізацыя, якая складалася тады з некалькіх чалавек. І з тых далёкіх дзён яе дзейнасць была накіравана на выхаванне новай, рабоча - сялянскай, савецкай інтэлігенцыі, на здзяйсненне культурнай рэвалюцыі ў нашай рэспубліцы. Камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх гаспадарчых і палітычных кампаніях, якія праходзілі ў краіне. Яны вытрымалі экзамен на грамадскую сталасць, удзельнічаючы ў нядзельніках, аказваючы дапамогу галадаючым, ведучы барацьбу з дзіцячай безнаглядзнасцю, ліквідуючы непісьменнасць сярод насельніцтва, працуючы ў падшэфных вёсках. У 30-я гады камсамольская арганізацыя заклікала ўсіх студэнтаў упарта авалодваць ведамі з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі кадраў інжынерна - тэхнічнай і навуковай інтэлігенцыі, умацоўваючы сувязі навуковых даследаванняў з патрабаваннямі сацыялістычнага будаўніцтва.

Суровую праверку на палітычную сталасць прайшла наша камсамольская арганізацыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сотні яе выхаванцаў аддалі свае жыцці ў барацьбе з фашызмам.

У пасляваенныя гады разам з вялікай работай па павышэнню паспяховасці і прыцягненню студэнтаў да навуковай работы наша камсамольская арганізацыя ўнесла вялікі ўклад у асваенне цалінных зямель і будаўніцтва ў аддаленых сельскіх раёнах БССР і краіны. Звыш 2000 байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў і ў гэтым годзе паспяхова завяршылі працоўны семестр. Працоўнае выхаванне стала магутным рычагом ідэалагічнай работы камітэта камсамола.

Шматгранней стала шэфская работа студэнтаў на прадпрыемствах, у калгасах, воінскіх часцях і асабліва ў сельскіх і гарадскіх сярэдніх школах. Студэнты - камсамольцы выступаюць з лекцыямі і дакладамі, канцэртамі мастацкай самадзейнасці, папаўняюць бібліятэкі сабранымі ў сябе кнігамі, арганізуюць алімпіяды, канферэнцыі чытачоў, вечары адпачынку, экскурсіі, спартыўныя паядынкі, дапамагаюць афармляць стэнды наглядная агітацыі, рыхтуюць моладзь да паступлення ў ВНУ і г. д.

Камсамольская арганізацыя не ўпускае з поля зроку і культурна - масавую работу, якая з'яўляецца састаўной часткай камуністычнага выхавання моладзі. На кожным факультэце ёсць свае агітбрыгады, плённа працуюць універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці, тром з якіх было прысвоена высокае званне народных: харавой капэле, ансамблю танца «Крыжачок», аркестру народных інструментаў.

Неад'емнай часткай камсамольскага жыцця стала спартыўна - масавая работа. Дзейнічаюць секцыі па большасці відаў спорту, сотні ўдзельнікаў прыцягвае круглагадавая спартакіяда, нашы студэнты з'яўляюцца членамі зборных каманд рэспублікі, ведамстваў і СССР. У цесным кантакце з камітэтам камсамола працуе арганізацыя ДТСААФ, за апошнія гады вялікіх поспехаў дабіліся мы ў ваенна-патрыятычнай рабоце.

Значна ўзмацнеў наш факультэт грамадскіх прафесій, створаны ў 1965 годзе. На шасці яго аддзяленнях (харэаграфічным, рэжысёрскім, хормайстарскім, лектарскім, піянерважатых, суддзяў і інструктароў па спорту) штогод сотні студэнтаў расшыраюць сваю эрудыцыю і атрымліваюць навыкі арганізатарскай работы.

Вялікай падзеяй у жыцці універсітэцкай моладзі з'явіўся Усесаюзны Ленінскі залік. На камсамольскіх сходах у групах, на патоках і курсах адбылася вялікая размова аб ролі камсамола ВНУ, павышэнні актыўнасці і баявітасці, фарміраванні светапогляду, аб адносінах да абывацельскага настрою.

Вы, дарагія першакурснікі, сталі нашымі калегамі ў перыяд Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!». Вам выконваць задачы, дакладна сфармуляваныя ў пастанове бюро ЦК ВЛКСМ аб правядзенні Ленінскага заліку. Вам неабходна скласці асабісты план «Вучымся камунізму, будуем камунізм», які будзе характарызаваць імкненне паленінску жыць, працаваць і вучыцца, паўсядзённа выконваць рашэнні партыі, актыўна займацца грамадскай работай.

Камсамольскія бюро груп, патокаў і курсаў павінны ў кантакце з выкладчыкамі распрацаваць меры, накіраваныя на забеспячэнне выдатнай і добрай вучобы юнакоў і дзяўчат, на прыцягненне іх да актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, да працы на карысць Радзімы.

За гады свайго існавання універсітэцкі камсамол праявіў уменне і баявы энтузіязм у рашэнні тых задач, якія ставілі перад ВНУ краіны партыя і ўрад. Мы ганарымся тым, што ў сувязі з 50-годдзем ЛКСМБ камсамольская арганізацыя БДУ ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Перад намі стаяць складаныя і адказныя задачы. Іх рашэнне ў вялікай ступені ў вашых руках, першакурснікі! Прыміце шчырыя віншаванні з пачаткам вашага студэнцкага жыцця!

А. ТОЗІК,
сакратар камітэта камсамола БДУ, дацэнт.



Уступныя экзамены... Гэтыя дні надоўга застануцца ў тваёй памяці, абітурыент-77, незалежна ад таго, стаў ты студэнтам ці збіраешся зноў наступным летам удзельнічаць у выпрабаванні на права вучыцца ва універсітэце.

Уступныя экзамены — час выбару шляхоў у жыцці. І няхай гэтыя шляхі будуць шчаслівымі.

Фота М. Дубовіка.



ПАЛАЖЭННЕ

АБ СТУДЭНЦКІМ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ АТРАДЗЕ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Студэнцкі сельскагаспадарчы атрад (ССГА) — гэта калектыў студэнтаў, створаны для аказання дапамогі сельскім працаўнікам у перыяд асенніх уборачных работ. ССГА накіроўваюцца ў калгасы і саўгасы рэспублікі рэктаратам, парткомам і камітэтам камсамола універсітэта. Яны ўдзельнічаюць у сельгасработах і вядуць грамадска-палітычную работу сярод насельніцтва.

Студэнцкія сельскагаспадарчыя атрады ствараюцца дэканатамі і камітэтамі камсамола факультэтаў на аснове плана, зацверджанага рэктарам універсітэта. Атрад фарміруецца з ліку студэнтаў адной ці некалькіх груп аднаго курса колькасцю да 25 чалавек.

Камандзір і камісар ССГА падбіраюцца камітэтамі камсамола, партбюро факультэтаў. Камандзір арганізуе ўсю работу атрада, нясе персанальную адказнасць за вытворчую, грамадска-палітычную работу, за бяспеку членаў атрада, выкананне пастаноў і распараджэнняў вышэйстаячых штабаў і камітэтаў. У аператыўным кіраўніцтве камандзіру належыць права адзінаначалля. Разам з тым камандзір абавязаны інфармаваць штаб атрада аб сваіх рашэннях.

Камісар нароўні з камандзірам нясе поўную адказнасць за жыццё і дзейнасць атрада, непасрэдна адказвае за ідэйна-выхаваўчую і грамадска-палітычную работу, арганізуе работу грамадскіх арганізацый ССГА. Камісар замяшчае камандзіра ў час яго адсутнасці.

Штаб ствараецца на першым арганізацыйным сходзе. Камандзір, камісар, брыгадзіры, камсорг уваходзяць у штаб па пасадзе. Акрамя таго, у штаб атрада могуць уваходзіць студэнты-актывісты. Састаў штаба зацвярджаецца камітэтам камсамола факультэта.

Брыгадзір назначаецца штабам атрада па рэкамендацыі камсамольскай арганізацыі вучэбнай групы. Ён з'яўляецца кіраўніком і арганізатарам дзейнасці брыгады на канкрэтным аб'екце і нясе адказнасць за ўсю яе работу, выкананне членамі брыгады правілаў тэхнікі бяспекі.

Для арганізацыі мэтанакіраванай і эфектыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці студэнтаў сярод насельніцтва на першым арганізацыйным сходзе ў атрадзе ствараюцца:

1. Пазаўстаўная камсамольская арганізацыя атрада, камсамольскія групы ў брыгадах.
2. «Камсамольскі пражэктар».
3. Рэдакцыя атраднай газеты.
4. Атрадная агітбрыгада. Састаў яе вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прад'яўленымі да студэнцкіх агітбрыгад.
5. Атрадная лектарская група ў саставе 3—5 чалавек.
6. Актыў па шэфству над школамі і ветэранамі вайны і працы.
7. Спартыўны сектар.
8. Рэвізійная камісія.

Таксама могуць быць створаны: партыйная група па рашэнню партбюра факультэта, школа камсамольскага актыву, кансультацыйны пункт, бюро добрых паслуг і г. д.

Члены атрада, якія добра паказалі сябе ў працы і грамадскай рабоце, заахвочваюцца рэктаратам, парткомам, камсамольскімі і прафсаюзнымі органамі па прадстаўленню штабаў ССГА. У сельгасатрадах выкарыстоўваюцца формы заахвочвання, існуючыя ў будаўнічых атрадах: пад'ём флага атрада, пісьмы з падзякай бацькам, прапаганда вопыту членаў атрада ў насценгазеце, перыядычным друку і г. д.

Парушэнне членам атрада нормаў камсамольскага жыцця, працоўнай дысцыпліны абмяркоўваецца штабам і агульным сходам атрада. Ён прыцягваецца да адказнасці, аж да выключэння з атрада і прымянення адміністрацыйных мер да парушальніка.

Штаб лінейнага атрада па заканчэнні работ робіць справаздачу перад партбюро, дэканатам, камітэтам камсамола факультэта аб выкананні вытворчай праграмы і плана ідэйна-выхаваўчай работы, аб стане дысцыпліны, тэхнікі бяспекі і аб здароўі байцоў у атрадзе. Дзённікі ССГА здаюцца ў камітэты камсамола факультэтаў.

ПАЛАЖЭННЕ

АБ АГЛЯДЗЕ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, УДЗЕЛЬНІЧАЮЧЫХ У СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТАХ

Агляд праводзіцца па наступных асноўных паказчыках:

I. Вытворчая дзейнасць.

1. Аб'ём і колькасць выкананых работ.
2. Захаванне правілаў тэхнікі бяспекі.
3. Захаванне правілаў працоўнай дысцыпліны.

II. Масава-палітычная, шэфская работа.

1. Пастаноўка палітыка-выхаваўчай работы ў атрадзе:
сходы (тэматыка, актыўнасць камсамольцаў);
правядзенне палітінфармацый;
выпуск атраднай насценгазеты;
арганізацыя сацспаборніцтва ў атрадзе;
арганізацыя адпачынку байцоў атрада;
арганізацыя сустрэч з ветэранамі вайны і працы, перадавікамі вытворчасці і іншымі вядомымі людзьмі;
падпіска на перыядычны друк.
2. Пазаатрадная работа:
Шэфская дапамога ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і працы;
шэфская дапамога сельскай школе;
лекцыйная прапаганда;
выступленні з канцэртамі мастацкай самадзейнасці;
арганізацыя спартыўных мерапрыемстваў;
мерапрыемствы, якія праводзяцца з мясцовай камсамольскай арганізацыяй.

ПАРАДАК ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ

1. Матэрыялы, якія адлюстроўваюць вынікі работы атрада, павінны быць здадзены на разгляд камітэтам камсамола факультэтаў да 1 кастрычніка.

2. Камітэты камсамола факультэтаў да 10 кастрычніка прадстаўляюць у камітэт камсамола універсітэта дакументы атрада — пераможцы факультэцкага агляду: выпіску з пратакола пасяджэння камітэта камсамола факультэта, дзённік атрада, кароткую справаздачу аб выкананні асноўных паказчыкаў гэтага палажэння. Да справаздачы таксама неабходна прыкласці насценгазеты, якія былі выпушчаны, баявыя лісткі, «маланкі», фотавітрыны, заметкі ў раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах аб рабоце атрада, граматы, пісьмы з падзякай кіраўнікоў гаспадарак і іншыя матэрыялы, якія сведчаць аб дзейнасці атрада.

3. Лепшыя атрады універсітэта вызначаюцца камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна да 20 кастрычніка.

МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

1. Атрад, які заняў I месца, па прадстаўленню камітэта камсамола ўзнагароджваецца Ганаровай граматай Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і экскурсійнай паездкай у сталіцу Савецкай Літвы — г. Вільнюс.

2. Атрад, які заняў II месца, узнагароджваецца граматай камітэта камсамола універсітэта і экскурсійнай паездкай у Брэсцкую крэпасць і Белавежскую пушчу.

3. Атрад, які заняў III месца, узнагароджваецца экскурсійнай паездкай у Брэсцкую крэпасць і Белавежскую пушчу.

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ!

Студэнцкі клуб з 1 верасня 1977 года аб'яўляе набор у наступныя калектывы:

1. Народны аркестр народных інструментаў.
2. Народны танцавальны ансамбль «Крыжачок» і падрыхтоўчую групу.
3. Студэнцкі драматычны тэатр.
4. Народную харавую капэлу.
5. Літаратурнае аб'яднанне «Узлёт».
6. Студыю мастацкага слова.

Запіс праводзіцца ў праўленні клуба (геафак, п. 4а) з 12.00 да 17.00.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 01418. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 1401.